**МОЭМ (Maugham) Уільям Сомерсет** (25.1.1874, Парыж — 16.12.1965), англійскі пісьменн1к. Вучыўся у Гайдэльбергскім ун-це, атрымаў мед. адукацыю ў Лондане. Першы раман «Ліза з Ламбета» (1897) напісаны ў традыцыях натурал1зму. Вядомасць прынёс аўтаб1яг. «раман выхавання» «Цяжар страсцей чалавечых» (1915, экранізацыя 1963), у якім духоўнае станаўленне героя, пошукі ім гуман!ст. ідэалаў. Праблемы творчасці і творцы, яго узаемаадносін з соцыўмам, маральна-этычныя пытанні ў цэнтры раманаў «Месяц 1 грош» (1919), «Размаляваная вуаль» (1925), «Пірагі і п1ва» (1930), «Тэатр» (1937, тэлефільм 1978), «Вастрыё брытвы» (1944) 1 інш. Майстар навелы (зб-кі «Трапятанне ліста», 1921; «Ад першай асобы», 1931; «Забаўкі лёсу», 1947, і інш.). Аўтар п'ес «Лэдзі Фрэдэрык» (1907), «Круг» (1921), «Шэпі» (1933) і інш., мемуарна-крытычных КН1Г «Падводзячы вынікі» (1938), «Пункт гледжання» (1959). Яго творчай манеры ўласцівы тонкі псіхалагізм, філігранная проза, майстэрства пабудовы сюжэта. На бел. мову навелы М. пера-клал1 В.Валынскі, Я.Міклашэўскі, Я.Верабей. Дзярж. т-р муз. камедыі Беларусі паводле яго рамана «Тэатр» паставіў мюзікл «Джулія» (1991).

Пе.: Бел. пер. — Апавяданні. Мн., 1990; Рус. пер. — Собр. соч. Т. 1—5. М., 1991—94; Тогда и теперь: Романы. М., 1991.

Л1т.: Английская литература, 1945—1980. М., 1987.

Т.Я.Камароўская

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ